# ГУЛЬНЯ-ВІКТАРЫНА “МОЙ СЛАЎНЫ ВІЦЕБСКІ РАЁН!” (ПРЫСВЕЧАНА 100-ГОДДЗЮ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА)

**Сінкевіч Ірына Леанідаўна,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі ДУА “Суйкаўская базавая школа”

***Родны край для мяне – як рай***

*На сённяшні дзень выхаванне ў школе павінна быць пабудавана так, каб забяспечыць аптымальнае развіццё кожнага дзіцяці, зыходзячы з непаўторнасці яго індывідуальнасці. У апошнія гады ўзрастае роля краязнаўства, калі адной з найважнейшых грамадскіх задач становіцца маральна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Краязнаўства лепш за іншыя галіны ведаў нараджае пачуццё патрыятызму і спрыяе фарміраванню грамадскай свядомасці. Веданне свайго краю, яго мінулага і сучаснасці неабходна для непасрэднага ўдзелу ў яго пераўтварэнні, паколькі родны край – жывая, дзейная часціца вялікага свету. Вывучаць гісторыю малой радзімы неабходна праз прызму лёсаў нашых землякоў, іх працоўнага і ратнага подзвігу. Гэта ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і працы, кавалеры Ордэнаў Працоўнай Славы. Нямала і нашых сучаснікаў маюць ганаровыя званні. І наша задача – захаваць памяць пра іх для будучых пакаленняў.*

Дадзены сцэнарый гульні-віктарыны з’яўляецца аўтарскай распрацоўкай Сінкевіч Ірыны Леанідаўны, настаўніца вышэйшай катэгоры ДУА “Суйкаўская базавая школа”.

**Мэта:** фарміраванне ў маладога пакалення нацыянальнай самасвядомасці, грамадска-патрыятычных пачуццяў, духоўнай культуры праз далучэнне да гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю.

*Вядучы 1.* Добры дзень, шаноўнае спадарства! Гісторыя Віцебскага раёна багатая на гістарычныя падзеі і гераічныя асобы. Тут жылі і жывуць адметныя майстры, таленавітыя музыканты, пісьменнікі і дзяржаўныя дзеячы. У гэтым годзе Віцебскаму раёну споўнілася 100 гадоў. У гонар юбілейнай даты мы сёння праводзім краязнаўчую гульню-віктарыну “Мой слаўны Віцебскі раён!”. Тэматыка пытанняў тычыцца нашага роднага раёна.

*Вядучы 2.* Дазвольце пазнаёміць вас з правіламі гульні:

1. У гульні прымаюць удзел 8 вучняў.
2. Удзельнікі павінны адказаць на пытанні пяці тураў.
3. У кожным туры некалькі пытанняў.
4. За кожны правільны адказ налічваецца адзін бал.
5. На абмеркаванне кожнага пытання даецца 10 секунд.
6. Пасля кожнага тура з гульні выбывае ўдзельнік, які атрымаў найменшую колькасць балаў. (Пры роўнай колькасці балаў даецца дадатковае пытанне.)
7. У фінал выходзяць тры ўдзельніка. Сярод іх і вызначаецца пераможца.

*Вядучы 1.* Нашу гульню-віктарыну будуць судзіць члены журы ў складзе … (прадстаўленне судзейскай камісіі).

*Вядучы 2.* На вашых сталах ляжаць таблічкі з лічбамі 1, 2, 3, 4. Выбіраючы адказ на пытанне, вы будзеце паднімаць тую таблічку, якая адпавядае, на ваш погляд, правільнаму адказу.

*Вядучы 1.* Пачынаем нашу гульню.

Фанфары паведамляюць пра пачатак кожнага тура. Вядучыя па чарзе задаюць пытанні ўдзельнікам віктарыны.

**І тур. «Гістарычны»**

1. Прадстаўнікам гэтага роду належалі калісьці значныя зямельныя ўладанні: Кашына, Падбярэззе, Лужасна, Тадуліна, Тулава і іншыя. (Агінскія, Радзівілы, Трубяцкія, Тышкевічы.)
2. Выдатны дзяржаўны і палітычны дзеяч БССР, які займаў самыя высокія пасады ў БССР і СССР. (Фёдар Сурганаў, Алесь Асіпенка, Мікалай Нікіфароўскі, Іван Собалеў.)
3. Хто ўзначаліў першы на Віцебшчыне партызанскі атрад? (І.Д. Чарняхоўскі, П.М. Шмыроў, Ф.Ц. Блахін, А.П. Белабародаў.)

4. Герой Савецкага Саюза, ураджэнец вёскі Заполле, які ваяваў у партызанскім атрадзе Д.Ф. Райцава. (П.І. Клімук, І.Р. Бумагін, М.Ф. Сільніцкі, Ф.П. Котчанка.)

5. Які з прапанаваных гербоў з'яўляецца гербам Віцебска?



1



2



3



4

6. У якім населеным пункце знаходзіцца Дзяржаўная ўстанова “Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей”

1) в. Лужасна;
2) аг. Акцябрская;
3) аг. Кіраўская;
4) в. Мазалава

**II тур. “Архітэктурны”**

1. Маёнтак, у якім з 1892 па 1900 год жыў і працаваў вядомы рускі мастак Рэпін (Адамава, Тадуліна, Здраўнёва, Сапраны.)



2. Якую назву носіць мемарыяльны помнік у вёсцы Заполле, які быў адчынены 3 ліпеня 1977 года? (“Віцебскія вароты”, “Праклён фашызму”, “Прарыў”, “Дальва”.)



3. Як называецца манастыр, заснаваны каля 1743 года трокскім ваяводам князем Тадэвушам Агінскім і яго жонкай княгіняй Ізабэлай на беразе маляўнічага возера Вымна? (Свята-Духаўскі жаночы манастыр, Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр, Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр, Свята-Пакроўскі жаночы манастыр.)

4. Назавіце мястэчка, у якім быў устаноўлены помнік дзецям П.М. Шмырова.

(Вымна, Бабінічы, Янавічы, Сураж.)




5. Што за будынак вы бачыце на фотаздымку?



1) Янавіцкая сярэдняя школа Віцебскага раёна;
2) Варонаўская сярэдняя школа Віцебскага раёна;
3) <u>Віцебскае кадэцкае вучылішча;</u>
4) Віцебскі дзяржаўны медыцынскі каледж імя І.П. Антонава

6. Дзе знаходзіцца алея знакамітых людзей Віцебскага раёна?



1) у аграгарадку Акцябрская;
2) <u>у аграгарадку Ноўка;</u>
3) у вёсцы Вымна;
4) у вёсцы Заронава.

**III тур. “Славутыя землякі”**

1. Беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч, які нарадзіўся ў вёсцы Зазыбы Віцебскага раёна (<u>М.Ц. Лынькоў,</u> Р.Л. Шакулаў, А.А. Дудараў, Р.І. Барадулін)

2. Самы высокі чалавек у свеце, які жыў у Віцебскім павеце непадалёк ад вёскі Старое Сяло (Іван Сцяпанаў, Рыгор Баранаў, <u>Фёдар Махноў,</u> Дзмітрый Сямёнаў.)

3. Беларускі этнограф, фалькларыст, асветнік, які жыў у вёсцы Вымна Віцебскага раёна (<u>М.Я. Нікіфароўскі,</u> І.А. Манькоўскі, У.С. Багданаў, А. Рыпінскі.)

4. Паэт, фалькларыст, кнігавыдавец, мастак, які нарадзіўся ў вёсцы Кукавячына Віцебскага павета ў сям’і шляхцічаў. (В.П. Славкук, <u>А.Ф. Рыпінскі,</u> В.І. Шчасны, Я.Ф. Баршчэўскі.)

**IV тур. “Легенды і паданні Прыдзвіння”**

1. Шмат гадоў жыла тут панна. Была яна старой. Не было ў яе ні дзяцей, ні ўнукаў, ані проста сваякоў. Быў у спадчыне толькі прыгожы замак. Але справы ішлі кепска, і, каб звесці канцы з канцамі, вымушана яна была браць шмат чаго ў доўг. Большасць пазык рабіла ў суседа. Калі ж памерла, то спадчына (замак і вёска) перайшла яму. Назва гэтай вёскі і ўзнікла ад слова доўг. (Перна, Ражнова, <u>Доўжа,</u> Шабуні.)

2. У гэтым мястэчку растуць два дрэвы – дуб і ясень. Пакуль дрэвы былі малыя, месца ім хапала, а як павырасталі, дык стала бракаваць. Абхапілі дрэвы адзін аднаго і пачалі біцца. Праз колькі дзён стаміліся і знясілелі ў канец. Зразумелі тады абое, што калі яшчэ трошку так адзін аднаго памучаюць, то жывым ужо ніхто не застанецца. Памірыліся яны і засталіся стаяць абняўшыся. А людзі сталі іх называць “братамі”. Як называецца мястэчка, у якім растуць дрэвы? (<u>Лужасна,</u> Міхалі, Ноўка, Вароны.)

3. Маецца на беразе гэтага возера адно цікавае месца. Завецца яно Казінчык. Згодна з легендай, шмат гадоў таму тут вадзіліся вялізныя-вялізныя самы. Ды такія, што аднойчы з’елі казу, якая прыйшла на бераг возера напіцца вады. На сённяшні дзень самоў у возеры ўжо не знойдзеш, а вось назва ўсё ж такі захавалася. Як называецца ўзгаданае ў легендзе возера? (<u>Заронаўскае,</u> Сосна, Шэвіна, Вымна.)

4. А у гэтай вёсцы добра ведаюць паданне пра Ігната Манькоўскага і маёнтак Мілае. Небагаты дваранін Ігнат Манькоўскі закахаўся ў дачку важнага вяльможы і пасватаўся да дзяўчыны. Каханне было ўзаемным, але бацька адмовіў, бо жаніх не меў ні маёнтка, ні высокага звання, і прапанаваў пасватацца Ігнату тады, калі ён стане багатым. Манькоўскі не стаў чакаць, а напісаў ліст імператару Паўлу І, у якім распавёў пра выпадак.

Павел І пашкадаваў закаханых і загадаў перадаць Манькоўскаму ў пажыццёвую ўласнасць фальварак і надаць Ігнату не наступны чын, а той, які ішоў праз адзін. Больш таго, ён згадзіўся быць сведкам з боку жаніха на вяселлі. Пасля такога бацька не змог адмовіць Манькоўскаму. Маладыя ажаніліся. Ігнат набыў вёску і пабудаваў маёнтак, які назваў “Мілае”. Ён захаваўся да нашых часоў. Якую вёску набыў Ігнат Манькоўскі? (Бабінічы, Казімірава, <u>Мазалава,</u> Ліпаўцы.)

**V тур. “Прырода Віцебшчыны”**

1. Назавіце самае вялікае возера Віцебскага раёна (<u>Лосвіда,</u> Вымна, Заронаўскае, Сосна.)

2. Назавіце найбольшую раку нашага раёна (Лучоса, Пестуніца, <u>Каспля,</u> Віцьба.)

3. У 1980-я гады на тэрыторыі Віцебскага раёна былі створаны батанічныя заказнікі, у якіх ахоўваюцца папуляцыі раслін, якія ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Колькі заказнікаў было створана? (2, 3, 4, <u>5</u>)

4. Назавіце самыя распаўсюджаныя карысныя выкапні ў Віцебскім раёне. (<u>Торф,</u> даламіт, гліна, сапрапель.)

У канцы гульні члены журы падводзяць вынікі і ўзнагароджваюць пераможцу і ўдзельнікаў.